# Глог-плакаты: методыка выкарыстання

**І. В. Беднякова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 6 г. Рагачова

Задача любога настаўніка – даваць веды вучням. Але хочацца, каб вучні не прымалі гатовае, а здабывалі самастойна.Таму на дапамогу не толькі настаўнікам, але і ўсім тым, хто імкнецца да ведаў, прыйшлі інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

Я прапаную сваім вучням плакат, але незвычайны – інтэрактыўны. Што такое інтэрактыўны плакат? Ён мае інтэрактыўную навігацыю, якая дазваляе адлюстроўваць неабходную інфармацыю: тэкст, фатаграфіі, відэа, гукавыя файлы, анімацыю, спасылкі, графіку. Глог можна вызначыць як мультымедыйную веб-старонку ці мультымедыйны постар. Глогі публікуюцца толькі на двух сайтах Glogster (для асабістага карыстання) і GlogsterEDU (для навучальных мэт). Створанаму глогу прысвойваецца ўнікальны адрас. Спасылку можна адправіць на сваю электронную пошту, дадаць у сэрвіс закладак, а сам плакат інтэграваць у прэзентацыю. Калі не жадаеце выкладаць сваю работу на ўсеагульны агляд, то можна пазначыць як асабісты, яго будзеце бачыць толькі вы самі.



Галоўная функцыя інтэрактыўнага плаката – забяспечыць высокі ўзровень нагляднасці, бо інфармацыя прадстаўляецца не адразу, а раскрываецца ў адпаведнасці з дзеяннямі карыстальніка, што дазваляе вызначаць глыбіню ўваходжання ў тэму. Можна арганізаваць работу як з усім класам, так і з асобным вучнем (на планшэце).

З дапамогай глога ў настаўніка ёсць магчымасць візуалізаваць метапрадметныя вынікі на аснове ацэньвання кампетэнцый у балах, каменціраваць і ацэньваць работу ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Адзін з раздзелаў ЭСН “Сіняя птушка” мае назву “Глог-плакаты” (электронны адрас https://sites.google.com/view/ptushka). Плакаты выкарыстоўваюцца ў наступных варыянтах: крыніца інфармацыі, “доказ меркаванняў”, творчы праект, дамашняе заданне або праверачная работа, трэнажор, карэкцыя ведаў, віртутальнае падарожжа, слоўнік па тэме.

Плакат “Душа застанецца – У. Караткевіч” выкарыстоўваю у розных класах.



Плакат дае магчымасць вучням кожнага класа ўзяць патрэбны для іх матэрыял: паслухаць вершы ў выкананні самога паэта, па фотаздымках пазнаёміцца з цікавымі фактамі біяграфіі, убачыць яго аўтограф, малюнкі, якія У. Караткевіч рабіў на сваіх аркушах, паглядзець відэаролік “Быў. Ёсць. Буду”, цікавую прэзентацыю-дослед.

Глог-плакат “Чарадзей роднага слова Р. Барадулін” выкарыстоўваю ў 8 класе пры вывучэнні верша “Трэба дома бываць часцей” і ў 11-м класе, калі аналізуецца жыццёвы і творчы шлях паэта. Можна паслухаць вершы і песні ў выкананні самога паэта, а таксама беларускіх гуртоў.



Плакат “І. Мележ “Людзі на балоце” прапануе нарэзку самых цікавых і яскравых эпізодаў з мастацкай стужцы.

У ЭСН “Сіняя птушка” размешчаны глог-плакаты па беларускай мове. Гэта плакаты-трэнажоры “Фразеалагізмы” для вучняў 5 і 10 класаў, “Віды сувязі ў словазлучэннях” для вучняў 8 класа, “Правапіс мяккага знака і апострафа”, “Правапіс у,ў”, “Правапіс прыставак”, “Вымаўленне спалучэнняў зычных”, “Асаблівасці напісання транскрыпцыі слоў”, “Прыналежныя прыметнікі, правапіс і




ўтварэнне” і іншыя, з якімі можна працаваць як на ўроках мовы, так і на факультатыўных занятках, таксама і дома для карэкцыі ведаў. Акрамя відэа, апорных схем, кластараў, вучні працуюць з інтэрактыўнымі тэстамі, створанымі ў праграме LearningApps.org.

Для вучняў самастойнае стварэнне глога дае магчымасць самарэалізацыі, самавыяўлення, далучэння да культурнай і духоўнай спадчыны беларускага народа.

Прапануем урок беларускай літаратуры ў 5 класе з выкарыстаннем глог-плаката на этапах вывучэння новага матэрыялу, падвядзення вынікаў.

**Тэма.** Казка пра жывёл “Музыкі”.

**Мэта:** знаёмства вучняў з казкамі пра жывёл, вызначэнне іх ролі ў жыцці чалавека.

**Задачы:** паглыбіць веды вучняў пра народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці; выпрацоўваць навыкі выразнага чытання і чытання па ролях; развіваць уменні вучняў узнаўляць паслядоўнасць падзей пры вусным пераказе, характарызаваць казачных герояў, аналізаваць адметнасці будовы; садзейнічаць спасціжэнню выхаваўчай ідэі фальклорнай казкі.

Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні *будуць ведаць* жанравыя адметнасці казак пра жывёл; вучні *будуць умець* выяўляюць свае адносіны да адлюстраванага, узнаўляць эпізоды, характарызаваць герояў па іх учынках, паводзінах, перажываннях.

**Эпіграф.** Казка не проста настаўнік, яна добры лекар, які дапаможа перажыць гора, смутак, трывогу.

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант** (стварэнне псіхалагічнага настрою і матывацыі да актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў на занятках).

*Настаўнік.* Вітаю вас, маладых, кемлівых і знаходлівых. Яшчэ старажытныя казалі: розум заўсёды заняты даследаваннем чаго-небудзь. І гэта бясспрэчна. Кожны наш урок – гэта крок да новых ведаў, гэта спасціжэнне новага, гэта вопыт, а ён нараджае мудрасць. Тую мудрасць, якую пакінулі нам у спадчыну нашы пращчуры. Усім старання, мыслення, поспеху!

Звернемся да эпіграфа да нашага ўрока. Як вы разумеце гэтыя словы? (*адказы вучняў*)

*Настаўнік.* М. Танк пісаў:




Я даўно раздарыў
Свае даўнія казкі,
Што чуў ад байкароў
І заморскіх, і наскіх,
Ад звяроў і пярнатых,
Ад далінаў, узгор'яў,
Ад снягоў і дажджоў,
Ад вятроў і сузор'яў.

*Вашу ўвагу звяртаю на інтэрактыўны плакат. Да нас на ўрок завітала казка пра жывёл. Скажыце, каго вы бачыце на карцінках? Хто з'яўляецца героямі казак пра жывёл? Якімі рысамі характару валодае вожык, конь, ліса, мядзведзь, воўк, мышка, заяц?*

- Назавіце вядомыя вам казкі пра гэтых жывёл.*(адказы вучняў)*

Давайце праслухаем аўдыёказку "Зайчыкі".

- Ці спадабалася казка? Чым? Якія па характары зайчыкі? Чаму яны страцілі сэнс свайго жыцця? Хто надаў ім мужнасці? А ці бывае так ў жыцці з чалавекам? *(адказы вучняў)*
- У рускай літаратуры таксама многа народных казак. Паспрабуйце па невялікім урыўку пазнаць казку.

| |
|---|
| -Что это за теремок? Из трубы идет дымок, видно, варится обед. Есть тут звери или нет? Кто, кто в теремочке живет? Кто, кто в невысоком живет?<br>-Я петушок-золотой гребешок, маслена головушка, шелкова бородушка.<br>-Я лягушка-квакушка.<br>-Я мышка-норушка.<br>-Я петушок-золотой гребешок.<br>-Я серый ежик, ни головы, ни ножек.<br>-А я волк-зубами щелк. |

*Настаўнік.* Малайцы! Гэта "Церамок"са сваімі жыхарамі. У мяне ў руках чароўны мяшэчак. У ім схаваны галоўныя героі нашай казкі, каб іх вызначыць, трэба адгадаць загадкі. *(Вучні па адным падыходзяць і выцягваюць аркушы паперы, зачытваюць уголас загадкі для ўсяго класа.)*

*1.* Касматы, вусаты, есці пачынае – песенькі спявае. (Кот). *2. Ляжыць пад ганкам, хвост абаранкам. (Сабака). 3.* Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час знае. (Певень) 4. Шэры, а не воўк, даўгавухі, а не заяц, з капытамі, а не конь. (Асёл).

*Настаўнік.* Малайцы! Героі нашай казкі Асёл, Кот, Сабака, Певень. І казка называецца "Музыкі", як і ў казцы "Церамок", "Зайчыкі", галоўныя героі жывёлы.

**ІІ. Вызначэнне мэты і задач урока** (сумеснае планаванне спосабаў дзейнасці ўрока**,** вызначэнне мэт і задач)

**ІІІ. Этап засваення і замацавання новай тэмы**

**1.Выразнае чытанне казкі "Музыкі"** настаўнікам і вучнямі.

*Слоўнікавая работа (тлумачэнне слоў: нетры, сметнік, прыпечак, жэрдачка, небарака)*

**2. "Мазгавы штурм"** (у кожнага на парце ляжаць аркушы паперы з пытаннямі, вучні іх уважліва чытаюць, аналізуюць і даюць адказы)

*Франтальная работа*

| |
|---|
| 1. Што вам спадабалася ў казцы? Чаму? |
| 2. Чым адметны кожны персанаж? Што дапамагло здзейсніць іх мару? Як бы вы паступілі на месцы жывёл у данай сітуацыі? |
| 3. Як вы ацэньваеце спеў сабакі, асла, ката і пеўня? |
| 4. Сустрэча з бандытамі. Чаму яны спужаліся гасцей? |

| |
|---|
| 5. Ці ўдалося сябрам з першага разу выгнаць разбойнікаў з лесу? Каго падсылаюць у разведку бандыты і для чаго? Чаму разбойніку стала так страшна? |
| 6. Назавіце месцы, на якіх размясціўся кожны з музыкаў. |
| 7. Хто шаснуў разбойніка нажом па руцэ? Хто агрэў шабляй па назе? Хто перацягнуў даўбешкай? Хто вылецеў і пачаў кап'ём у галаву тыкаць? |
| 8. У чым сіла музыкаў? Чаму павучае казка? Якімі словамі яна заканчваецца? |
| 9. Ахарактарызуйце казкі пра жывел: назавіце ўдзельнікаў, каго нагадваюць іх паводзіны, якая мова казак? |
| 10. Уявіце, што вы кінарэжысёр. Як бы паказалі далейшае жыццё герояў? У якія вандраванні вы адправілі іх? Паразважайце. |

*Настаўнік.* Казка "Музыкі" зачынам нагадвае байку рускага байкапісца І.Крылова "Квартэт", а далей мае свой незвычайны сюжэт. Нягледзячы на розныя музычныя густы і майстэрства, героі казкі моцныя таму, што ўмеюць падтрымаць адзін аднаго, разам змагацца з ворагам.

3. **Інсцэніроўка казкі.**

-*Конкурс на лепшага артыста (чытанне па ролях)*

**4. Табліца якасцей герояў казкі** *(на аркушах паперы вучні запісваюць якасці персанажаў у парах (у кожнай пары свае жывёлы), а пасля калектыўна абмяркоўваюць)*

| **Сабака** | **Кот** | **Асёл** | **Певень** |
|---|---|---|---|
| разумны<br>верны<br>адданы<br>вартаўнік<br>вольналюбівы<br>энэргічны<br>паслухмяны | актыўны<br>незалежны<br>вольналюбівы<br>баюн<br>кампанейскі<br>гуллівы | цярплівы<br>паслухмяны<br>упарты<br>жартаўлівы | клапатлівы<br>артыстычны<br>вартаўнік<br>прыгажун<br>свавольны |

**IV. Фізкультхвілінка** (зрокавыя практыкаванні)

**V. Кантроль ведаў і ўменняў**

*Настаўнік. Давайце ўспомнім прыказкі пра жывёл (вучні працуюць з аркушамі паперы, на якіх напісаны прыказкі, выбіраюць па адной і даюць свае каментарыі)*

1. Каня не дагледзіш, далёка не паедзеш. 2. Свой спеў аслу мілы. 3. На пакорлівага асла двое садзяцца. 4. Кот да дому прывыкае, а сабака – да гаспадара. 5. І сабака ласкавае слова ведае. 6. Усякі певень на сваім папялішчы гаспадар.

***Міні-тэст.*** Знайдзіце адпаведнасць літар і лічбаў.

А_; Б_; В_; Г_.     А_; Б_; В_; Г_.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| А. Певень | 1. за сталом | **М У** | А. Певень | 1. І-і -і-і! |
| Б. Кот | 2. на парозе | **З** | Б. Кот | 2. Гаў-гаў-гаў! |
| В. Асёл | 3. на страсе | **Ы** | В. Асёл | 3. Мэ-мэ-мэ! |
| Г. Сабака | 4. на сметніку | **К** | Г. Сабака | 4. Мяў-мяў-мяў! |
| | 5. на жэрдцы | **І** | | 5. Ку-ка-рэ-ку! |



*Настаўнік.* Прапаную незвычайнае заданне “**Кросэнс”.**

Праз Кросэнс раскрыйце змест казкі. *(Спачатку вучні працуюць у парах, а пасля – **калектыўнае абмеркаванне)***

*Настаўнік.* Парк Дыснэйлэнд, вядомы вялікай колькасцю казачных персанажаў.

**Творчае пытанне.** Калі б у Беларусі пабудавалі такі казачны парк герояў, забаў, стылізаваны пад чароўны свет, то якую назву вы б яму далі? *(адказы вучняў)*



**VI. Падвядзенне вынікаў урока**

*Настаўнік.* Звяртаю вашу ўвагу на

інтэрактыўны плакат. Паглядзіце ўважліва і скажыце: з якімі героямі вы пасябравалі б? (адказы вучняў)

**Дамашняе заданне**. *С. 45; выберыце на інтэрактыўным плакаце жывёлу або жывёл і вусна складзіце міні-казку.*

**VII. Рэфлексія**

---

**Сінквейн (з белымі плямамі)**

***Казкі пра жывёл***

*шчырыя,*

________*вучаць,*______

______________________

______________________

**Выстаўленне і каменціраванне адзнак**

---